**Андрэй Кувік**

# Дарога даўжынею ў жыццё…

Старыя, здзервянелыя ногі ледзь перасоўваліся па мокрым, зацярушаным брудным снегам тратуары. Гэтае ціхае шорганне было тут чужым, яно ніяк не магло ўплясціся ў гучную, паспешную мелодыю халоднага горада… Толькі недзе высока ў небе, праз завесу фабрычнага дыму, маўкліва пазіралі зверху на Тэклю яе  старыя знаёмыя – сівыя хмаркі.

Старая не ведала, куды ідзе. Вочы быццам нічога не бачылі. Яна не глядзела на людзей, што ішлі па вуліцы насустрач, не заўважала брычкі, якія жвава насіліся па дарозе.

Што адбывалася ў душы Тэклі… Крыўда…Здрада… Пустэча… Не! І яшчэ раз не! Не было камяка ў грудзях, які б  чавіў бяздушным каменем і перашкаджаў дыхаць. Не было слёз у выцвілых вачах. Толькі зрэдку, раз-пораз, варушыліся патрэсканыя вусны, у немым шэпаце выдаючы яе думкі:

– Не пазнаў… Напэўна ж! Пастарэла вельмі… Столькі год прайшло… Вядома, што не пазнаў! Каб пазнаў, дык адразу б прыняў, не прагнаў… Не! Не мог мой сыночак! Не мог мой любы Лаўручок матку прагнаць! Проста не пазнаў… Не паверыў… Трэба вярнуцца! Яшчэ раз пагаварыць з ім! Куды яму помніць усіх? У яго ж столькі спраў важных!

Далей думкі гэтыя змяняліся прыемнымі успамінамі. Матчына памяць малявала ёй усмешкі зусім маленькага Лаўручка, які цягнуў да яе свае ручкі, нешта пытаў, заліваўся смехам. Усё жыццё Тэкліна было ў гэтых успамінах… Ніколі і ніхто не зможа забраць у яе такое шчасце!

Вочы старой быццам ажылі, напоўніліся свежымі колерамі. Надзея і вера абудзілі іх.

– Трэба вярнуцца, – у каторы раз неведама каму даволі гучна прамовіла Тэкля.

Яна агледзелася навокал:

– Добра, што зусім недалёка адыйшла.

Тэкля апусціла вочы, паглядзела на замерзлыя ногі, на лапці, з якіх ужо там-сям тырчала зчэсанае лыка.

– Зусім ужо ногі мае занямелі ад холаду… Ну, нічога, зараз да сына дайду… там ужо адагрэюся.

Яна развярнулася і пацягнулася назад да панскага падворку. Уяўленне зноў пачало маляваць ёй прыемныя вобразы будучыні. Вось яна гуляе з унукамі-жэўжыкамі, якія, як дзве кроплі вады, падобныя на Лаўрука. Следам прыйшоў вобраз, як яна сядзіць за сталом, п’е духмяную гарбату  са свежымі праснакамі ды размаўляе з сынам.

І так добра зрабілася Тэклі, так прыемна, што забылася яна і пра холад і пра ўсе свае жыццёвыя няшчасці. Як на крылах нясло яе матчына сэрца, матчына любоў да роднай кравіначкі, едынага сыночка.

Дайшоўшы да знаёмых варот, Тэкля спынілася. Не стала падымацца на сходы. У душы пасяліўся нейкі неспадзяваны страх. Адкуль толькі ўзяўся.

– Не буду стукаць у дзверы, - думалася ёй, - можа сынок заняты якімі важнымі справамі. Навошта ж я буду яму перашкаджаць. Тут вось пачакаю, пакуль хто з дзвярэй не пакажацца, а ўжо потым…

Так сябе супакоіўшы, Тэкля прытулілася ля варот і пачала чакаць...

Пасля сустрэчы з матуляй Лаўрэнцій Кіпрыянавіч не знаходзіў сабе месца. Ён хаатычна хадзіў з пакоя ў пакой і спаганяў злосць на ўсіх слугах.

– Чаго гэта тут панакладвалі! – істэрычна лаяўся ён, не раўнуючы як старая Піліпава сучка.

– Падлогу дрэнна памылі! Зусім ужо абляніліся! Я вам пакажу! Абы толькі языкамі часаць ды нічога не рабіць! – амаль паўгадзіны раваўся гарлахват.

Пасля, крыху супакоіўшыся, закрыўся ў сваім кабінеце. Гнеўныя думкі змянялі адна адну:

– Гэтага мне яшчэ не хапала! Прыперлася! Хіба нехта яе зваў? Пазорыць мяне прыйшла! Добра яшчэ, што Адэля яе не бачыла, а то было б мне… Даведалася б, што я не панскага роду… з сялян…з жабракоў гэтых! Толькі б хто з хатніх не прагаварыўся…

– Ашчаслівіла яна мяне. Нарадзіла – і ўсяго! Не хачу нават успамінаць гэту галыцьбу! А яна пры слугах мяне Лаўручком заве! Які я табе сыночак? Быў Лаўрук – ды весь выйшаў! Вось і ўся размова! Цяпер я Лаўрэнцій Кіпрыянавіч! Паважаны чалавек!

Але, не гледзячы на ўвесь гэты запал, не пакідала Лаўрэнція Кіпрыянавіча пачуццё нейкай няпэўнай… трывогі, ці, нават, даўно забытага сораму. Хацелася апраўдацца перад самім сабою. І ад гэтага яшчэ больш брала злосць.

– Грошай, напэўна, захацела! Дык папрасіла б неяк інакш. Каб ніхто не бачыў. Я ей і так дзевяць рублёў даў! Яна такіх грошай век не бачыла! Няхай сядзіць сабе там у лясным кутку ды не скардзіцца. Лічы, я ёй зараз больш даў, чым яна мне за ўсё жыццё!

Лаўрук, нарэшце, спыніўся, перастаўшы мераць крокамі кабінет.

– На ўвесь дзень настрой сапсавала. Трэба выехаць куды-небудзь, галаву праветрыць.

Лаурэнцій Кіпрыянавіч выйшаў з кабінета і загадаў закладваць брычку.

Тэкля ўжо амаль акалела, стоячы сгорбыўшыся пад варотамі, калі пачула, што ў двары нехта заварушыўся. Вароты пачалі адкрывацца, і старая была вымушана крыху адступіцца. Праз некалькі хвілін у двары пачулася некалькі галасоў, застукалі дзверы, заскрыпелі па заснежанай зямлі розныя крокі. Тэкля ўважліва прыслухоўвалася да кожнага крока, кожнага гука. Вось пачуліся паважныя крокі, заскрыпелі рысоры – нехта важны сеў у брычку.

– Да рэстарацыі пана Яноўскага, - пачуўся моцны загад.

Матуліна сэрца замітусілася, як птушачка ў далонях.

– Гэта ён! Мой Лаўручок!- ускінулася ўзрадавана Тэкля. Яна кінулася да хварткі, што збоку каля варот, але тая была зачынена. Тады старая кінулася прама ў адчыненыя вароты, насустрач доўгачаканаму сыну!

Фурман толькі сцебануў коней пугаю, набіраючы ходу, як з-пад варот выскачыла нейкая небарака.

– Тп-ру-у-у-у!- зацягнуў лейцы вазніца. Але было ўжо позна… Коні з разгону не змаглі адразу спыніцца і стапталі незнаёмую старую.

– Што там?- саскочыў з брычкі Лаўрэнцій Кіпрыянавіч, гнеўна пытаючыся ў фурмана.

– Ды вось…тут, - няёмка мяўся вазніца, - сама выскачыла. Я не паспеў спыніцца.

На зацярушанай снегам зямлі, як на белым саване, ляжала Тэкля. Са скроні паволі сачылася кроў, хутка паглынаючы тысячы шэра-белых сняжынак. Яна была яшчэ жывая…

Лаурук у першае імгненне кінуўся да яе, але… раптам, спыніўся. І толькі вусны бязгучна склаліся ў слова:

– Мама…

Згасаючым позіркам Тэкля глядзела на сына. З надзеяй…З любоў’ю… Без болю і крыўды. Толькі сусрэўшы, развітвалася… Ад слепаватых вачэй не схавалася нямое слова сына.

– Пазнаў! Ён мяне пазнаў! – узрадавалася душа старой, - мой Лаўручок мяне пазнаў!

З гэтаю доўгачаканаю радасцю, пад апошні стук сэрца, душа старой Тэклі ўзнялася ў нябёсы і паляцела да знаёмых сівых хмарак, да старога сталетняга лесу…

Лаўрэнцій Кіпрыянавіч цяжкім позіркам агледзеў усіх, хто сабраўся паглядзець і крыкнуў:

– Няма чаго глядзець! Займаецеся сваімі справамі!

А потым ужо больш спакойна звярнуўся да лёкая:

– Паклічце гарадавога. Растлумачце, што здарыўся няшчасны выпадак. Развялося тут жабракоў усялякіх.

Накіраваўся да брычкі, і ўжо садзячыся, яшчэ раз падазваў лёкая:

– На вось, – працягнуў два чырвонцы, – няхай пахаваюць як чалавека.

Брычка выехала з панскага двара і шпарка панялася па вуліцы, імгненна ўліваючыся ў бязлітасную гаманкую мелодыю халоднага горада.

А ў гэты момант шчаслівая душа старой Тэклі шпарка нясласе па небе да родных мясцін. Там скончыцца яе дарога. Дарога даўжынёю ў жыццё…